# Новае аб старым



Крысціна ЯРМОЛІЧ

**Вядомыя гісторыкі Андрэй Вашкевіч і Віктар Саяпін прадставілі вынік сумеснай працы – новую кнігу пра гарадскую прамысловасць «На гродзенскім «бруку». Прэзентацыя адбылася 30 чэрвеня ў Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Яўхіма Карскага.**

Па словах Андрэя Вашкевіча, гісторыя выдання пачалася яшчэ ў 2012 годзе, калі кожны з аўтараў выпусціў асобную кнігу пра мінулае гродзенскай прамысловасці. А ў 2014 годзе яны вырашылі аб'яднаць свае намаганні. У выданні «На гродзенскім «бруку» з'явіліся новыя раздзелы, аўтары выкарысталі шмат фатаграфій, ілюстрацый і арыгінальных карт. Гісторыкі задаліся мэтай расказаць пра ўсе самыя цікавыя гарадзенскія прадпрыемствы і будынкі, якія ад іх засталіся. Яны хацелі паказаць, што Гродна не проста правінцыйны горад: ён знакаміты ў свеце сваімі вырабамі. Таксама Андрэй Вашкевіч распавёў пра былыя гарадзенскія брэнды, якія маглі б быць цікавыя і ў наш час.

Напрыканцы Віктар Саяпін праанансаваў выхад сваёй новай кнігі «Гродна і гродзенцы. 30 гадоў у сярэдзіне 20 стагоддзя», якая будзе даступная ўжо ў канцы верасня-пачатку кастрычніка. Пасля сустрэчы ўсе жадаючыя атрымалі магчымасць пагутарыць з аўтарамі і набыць кнігу з аўтографамі.



Фота Яраслава Ванюкевіча.